Калета Р. (Варшава)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ЗАМЕЖНАЯ Ў ПОЛЬШЧЫ І Ў СВЕЦЕ

У Польшчы беларуская мова як замежная выкладаецца ў розных універсітэтах, напр. у Варшаве, Беластоку, Любліне, Кракаве (больш гл. [1], [12], [30] і [34, с. 72]). Вывучаюць яе галоўным чынам палякі, але усё часцей таксама замежнікі іншых нацыяналнацсяў, якія прыязджаюць у Польшчу вучыцца ў польскіх ВНУ. Напрыклад на Кафедры беларусістыкі беларускую мову вывучалі нават іспанка, расіянка ды літовец. У Варшаўскім універсітэце беларуская мова як замежная выкладаецца на Кафедры беларусістыкі (больш гл. [2] і [34]) і на Кафедры міжкультурных даследаванняў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Супрацоўнікі Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта вядуць таксама бясплатныя курсы беларускае мовы ў Культурным Цэнтры Беларусі ў Польшчы, які пачаў сваю працу ў ліпені 2008 года пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча. Варта яшчэ падкрэсліць, што студэнты варшаўскай Праваслаўнай духоўнай семінарыі таксама маюць магчымасць вывучаць беларускую мову, якую выкладае там выпускніца Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта.

Нягледзячы на багатую спадчыну польскай беларусістыкі, трэба сказаць, што не хапае навуковых даследаванняў з галіны беларусістычнай глотыдыдактыкі. Пытанне беларускай мовы як замежнай разглядаецца ў нешматлікіх артыкулах Агнешкі Гораль (гл. [31]) з Любліна і Радаслава Калеты (гл. [34]) з Варшавы, хаця ёсць і розныя падручнікі, слоўнікі ці манаграфіі (напр. [10], [33], [37], больш. гл. [34]). Сярод беларускіх даследчыкаў, якія закраналі гэтую тэму (у артыкулах і падручніках), можна узгадаць такія прозвішчы, як Барысенка (гл. [3] і [6]), Важнік (гл. [7] і [8]), Клябанаў (гл. [36]), Крывіцкі, Міхневіч і Паддужны (гл. [15]), Малажай (гл. [16]), Рамза (гл. [19] і [20]), Станкевіч (гл. [21]), Сысой (гл. [22]), Сямешка (гл. [9]), Хоміч (гл. [23]), Чахоўская (гл. [24], [25] і [26]), Чахоўскі (гл. [27] і [28], Pashkevich (гл. [38]), Stankevich (гл. [40]) і інш., напр. [17]. У Японіі беларускай мовай як замежнай займаецца Сіёры Кіёсава з Цыкубскага ўніверсітэта, якая ў 2016 годзе ў суаўтарстве надрукавала кнігу *Спрабуйма! Азнаямяльна-пачатковы курс беларускай мовы для японцаў. Частка I* (гл. [20]). Кафедрай беларусістыкі і Кафедрай міжкультурных даследаванняў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Варшаўскага ўніверсітэта рыхтуюцца новыя падручнікі па беларускай мове для палякаў, але не хапае навуковай манаграфіі прысвечанай пытанням беларускай мовы як замежнай (беларусістычнай глотадыдактыкі). Беларуская мова як замежная на ўніверсітэцкім (навуковым) узроўні даследуецца ў Варшаве ў Майстэрні беларусістычнай глотадыдактыкі, якая была створана 1 снежня 2015 г. на Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта. У рамках Майстэрні даследуюцца разнастайныя праблемы беларускай мовы як замежнай, напр.:

1) методыка выкладання – метады выкладання граматыкі, ведаў аб Беларусі; развіванне навыкаў вуснага маўлення, аўдыявання, чытання і

пісьма; новыя тэхналогіі на занятках па беларускай мове[1]; азнаямленне з літаратурнымі тэкстамі; выкарыстанне літаратурных тэкстаў у міжнародных, аднанацыянальных групах і ў (не)славянскіх групах і г. д.;

2) беларушчына замежнікаў – аналіз моўных памылак; даследаванне г. зв. пераходнай мовы (анг. *interlanguage*) і вымаўлення;

3) параўнальная глотадыдактыка – напр. беларуска-польская, беларуска-расійская, беларуска-нямецкая і г. д.; даследаванне падабенстваў і адрозненняў моў; параўнанне метадаў выкладання, праграмаў курсаў, цяжкасцяў моў, ролі выкладчыка і г. д.

4) гісторыя і сучаснасць выкладання беларускай мовы як замежнай (параўн. [6]) – старыя і новыя падручнікі беларускай мовы як замежнай, спосабы прэзентацыі матэрыялу, тэматычная разнастайнасць;

5) мова і культура – пытанні культурнай лінгвістыкі (лінгвакраіназнаўства, лінгвакультуралогія, беларусазнаўства); міжкультурная камунікацыя, выкладанне мовы і культуры Беларусі; месца культуры ў выкладанні мовы; прымаўкі, прыказкі, фразеалогія, безэквівалентная лексіка, маўленчы этыкет; стэрэатыпы ў падручніках, роля мужчыны і жанчыны; распаўсюджаныя імёны і прозвішчы, рысы характару беларусаў; табуізацыя некаторых тэм, як эротыка, смерць, рэлігія; ідэалізацыя герояў падручнікаў, іх сям'і[2];

6) моўная прагматыка – напр. прывітанне, развітанне, падзяка, прабачэнне, просьба;

7) праблемы сертыфікацыі ўзроўняў валодання беларускай мовай як замежнай (гл. [4, с. 3], параўн. [26]);

8) беларуская мова як замежная ў Беларусі ды за мяжой;

9) прыклады матэрыялаў, практыкаванняў ды заняткаў па беларускай мове як замежнай (параўн. [25] і [28]);

10) праблемы адукацыі і працы выкладчыкаў беларускай мовы як замежнай у Беларусі і за мяжой, памылкі лектараў (параўн. [16] і [22]).

У Майстэрні беларусістычнай глотыдактыкі Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта даследуецца г. зв. пераходная мова (анг. *interlanguage*) палякаў, якія вывучаюць беларускую мову. Аналізуюцца моўныя памылкі і ствараецца іх корпус і тыпалогія (параўн. [13] і [34]). У Беларусі моўныя памыўкі разглядаюцца галоўным чынам у кантэксце беларуска-рускага двухмоўя, наступствы якога назіраюцца ў мове беларусаў (гл. [14] і [15]). Існуе патрэба навуковай распрацоўкі тыпалогіі моўных памылак замежнікаў розных нацыянальнасцяў, якія вывучаюць беларускую мову, напр. у Нямеччыне (гл. [32]), Вугоршчыне (гл. [21]), ці Японіі (гл. [20]).

---

[1] Гэтае пытанне абмяркоўваецца ўжо ў беларускіх апрацоўках, прысвечаных беларускай мове як роднай (гл. [11]).

[2] У галіне лінгвакраіназнаўства ёсць ужо пэўныя дасягненні, аб чым сведчаць кнігі выдадзеныя як у Беларусі, так у Польшчы, напр. *Беларусазнаўства. Навучальны дапаможнік* (гл. [5]), *Культура і гісторыя беларусаў: тэксты і заданні. Вучэбны дапаможнік па практыцы беларускага маўлення для замежных студэнтаў* (гл. [8]) ды *Крок да кроку знаёмімся з Беларуссю: мова, культура, краязнаўства* (гл. [36]);

Добра было б, каб лектар ведаў, якія памылкі найчасцей робяць замежнікі ў выніку моўнай інтэрферэнцыі. Дзякуючы таму ён мог бы рыхтаваць адмысловыя практыкаванні і падаваць канкрэтныя правілы, якія адрозніваюцца ад моўных звычак і структуры мовы замежніка. Дзеля гэтага неабходна развіваць даследаванні (механізмаў) памылак замежнікаў. Стварыць трэба даведнік цяжкіх месцаў беларушчыны, каб лектары і навучэнцы маглі звярнуць асаблівую ўвагу на пытанні, якія часта бываюць крыніцай памылак. У другой частцы такой кнігі маглі б быць змяшчаныя практыкаванні ды адказы да іх, каб можна было выкарыстоўваць кнігу як на занятках з лектарам, так у самастойнай працы як самавучак. Версіі выдання маглі б дастасоўвацца да патрэб канкрэтных нацыянальных груп замежнікаў, таму што цяжкасці беларускай мовы будуць іншыя напр. для палякаў ды немцаў. У Польшчы не хапае публікацыяў, якія паказвалі б палякам іх памылкі ў беларускай мове і прапанавалі іх выпраўленне дзякуючы розным практыкаванням. Як вядома, калі памылкі не выпраўляюцца, навучэнцы лічаць іх правільнымі формамі (моўнай нормай), таму існуе патрэба стварыць дапаможнік, у якім аналізаваліся б цяжкія месцы беларушчыны.

Не хапае навуковых часопісаў, прысвечаных пытанням выкладання беларускай мовы як замежнай (і шырэй – пытанням беларусістычнай глотадыдактыкі), дзе даследчыкі і выкладчыкі маглі б дзяліцца сваім досведам ды вынікамі сваіх даследаванняў. Паасобныя артыкулы можна знайсці на старонках беларускіх выданняў, такіх як напр. «Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы» і «Беларусіка = Albaruthenica». У Майстэрні беларусістычнай глотыдактыкі Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта (пры падтрымцы даследчыкаў з розных замежных і беларускіх навуковых цэнтраў, у тым ліку з Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) быў створаны навукова-метадычны часопіс «Беларуская мова як замежная» як навуковая прастора для даследчыкаў, якія захочуць абменвацца думкамі і дзяліцца сваімі ідэямі ды досведам. Мэта часопіса – спрыяць пастаяннаму развіццю не толькі даследчыкаў, але таксама самой галіне навукі, якой з’яўляецца беларусістычная глотадыдактыка. У навуковай радзе часопіса «Беларуская мова як замежная» засядаюць: Генадзь Цыхун (Нацыянальная акадэмія навук Беларусі), Лідзія Сямешка (Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы), Сяргей Важнік (Інстытут нацыянальнай адукацыі Рэспублікі Беларусь), Людміла Сінькова (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), Таццяна Рамза (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), Ларыса Пісарэк (Польшча, Вроцлаўскі ўніверсітэт), Аляксандр Кіклевіч (Польшча, Вармінска-Мазурскі ўніверсітэт у Ольштыне), Алена Пацехіна (Польшча, Вармінска-Мазурскі ўніверсітэт у Ольштыне), Аляксандр Скапненка (Украіна, Нацыянальная акадэмія навук Украіны), Зінаіда Пахолак (Украіна, Усходнееўрапейскі нацыянальны ўніверсітэт імя Лесі Украінкі), Джым Дынглі (Вялікабрытанія, Беларуская бібліятэка імя Францішка Скарыны ў Лондане), Арнольд

Макмілін (Вялікабрытанія, Лонданскі ўніверсітэт), Курт Вулхайзер (ЗША, Брандайскі ўніверсітэт). У часопісе матэрыялы друкуюцца па-беларуску. Усе ахвотныя могуць дасылаць свае свае артыкулы і рэцэнзіі (падрабязная інфармацыя знаходзіцца на старонцы Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта). Матэрыялы часопіса будуць даступны таксама ў Інтэрнэце, каб даследчыкі з усяго свету маглі імі карыстацца.

Падобны часопіс маюць ужо ўкраіністы, якія з 2006 г. у Львоўскім нацыянальным універсітэце імя Івана Франко 2 разы ў год выдаюць часопіс, прысвечаны тэорыі ды практыцы выкладання ўкраінскай мовы як замежнай «Теорія і практика викладання української мови як іноземної». У Польшчы існуюць часопісы, прысвечаныя польскай мове як замежнай (напр. у Варшаве «Kwartalnik Polonicum», у Лодзі «Kształcenie Polonistyczne Cudzoziemców», у Катовіцах «Postscriptum Polonistyczne»).

Трэба яшчэ дадаць, што не хапае комплекснага выдання па методыцы беларускай мовы як замежнай. Г.К. Чахоўскі акрэслівае методыку наступным чынам:

«Методыка – навуковая дысцыпліна, якая належыць да педагагічных навук і ў дачыненні да педагогікі з’яўляецца прыватнай дыдактыкай – тэорыяй навучання канкрэтнаму прадмету. У адносінах да дысцыпліны «беларуская мова як замежная» – гэта навука аб законах і правілах навучання беларускай мове і спосабах авалодання і карыстання мовай. Больш разгорнута азначэнне методыкі як навуковай дысцыпліны можна падаць так: гэта навука, якая вывучае мэты, змест, сродкі, метады, арганізацыйныя формы навучання беларускай мове і азнаямлення з культурай Беларусі, а таксама спосабы навучання, выхавання і авалодання беларускай мовай у працэсе яе вывучэння» [27, с. 183,] (параўн. [18] і [29]).

У кнізе трэба было б выдзеліць агульную методыку ды прыватную методыку, якая адносілася б да канкрэтных нацыянальных груп замежнікаў, таму што методыка выкладання беларускай мовы славянам будзе адрозніваццa ад методыкі выкладання беларускай мовы еўрапейцам з Заходняй Еўропы, азіятам альбо арабам. Кніга такая патрэбная асабліва беларускім лектарам, для якіх беларуская мова з’яўляецца роднай, таму што яны вымушаны навучыцца глядзець на беларускую мову вачыма замежніка, які павінен вывучыць канкрэтныя граматычныя правілы, каб без памылак карыстацца беларускай мовай. Звычайна аб такіх правілах носьбіт мовы (*нэйціў-спікер*) не мае ўялення і ўвогуле аб іх не думае, карыстаючыся сваёй роднай мовай. Лектар павінен ведаць такія правілы і прэзентаваць іх навучэнцам на занятках дзеля практычнага карыстання мовай, а таксама выканання адмысловых практыкаванняў, якія дапамагаюць замацаваць веды і ўтварыць на іх аснове маўленчыя навыкі ды ўменні.

Акрамя методыкі важная таксама праграма навучання беларускай мове як замежнай. Што датычыць польскай мовы як замежнай, існуе выданне *Programy nauczania języka polskiego jako obcego. Poziomy A1–C2* [39], у якім змяшчаная падрабязная інфармацыя адносна матэрыялу, з якім навучэнцы

павінны азнаёміцца ў залежнасці ад моўнага узроўню. Кніга прэзентуе створаныя моўныя мінімумы для розных этапаў навучання. На ўзор іншых моў неабходна таксама распрацаваць падобныя праграмы навучання беларускай мове на розных узроўнях валодання мовай (параўн. [7, с. 22]. У такіх праграмах павінны быць акрэсленыя тэматычныя блокі, падручнікі, якімі можна карыстацца, тэксты для чытання, граматычны матэрыял і г. д. Такое выданне дапамагала б не толькі выкладчыкам, якія вядуць курсы, але таксама навучэнцам, якія былі б зацікаўленыя сертыфікатам беларускай мовы як замежнай. Пры падрыхтоўцы тэстаў у рамках праекту сертыфікату можна было б адначасова рыхтаваць праграмы курсаў, якія дапамагалі б жадаючым падрыхтавацца да тэста на сертыфікат. Ведаючы канкрэтныя патрабаванні, некаторыя маглі б нават самастойна рыхтавацца да экзамену, карыстаючыся рэкамендаванымі падручнікамі ды матэрыяламі, якія змяшчалі б патрэбную моўную інфармацыю ды лексічныя і граматычныя практыкаванні.

Што датычыць выкладчыкаў беларускай мовы як замежнай, нельга забываць, што не толькі беларусы выкладаць беларускую мову. Ёсць і замежныя спецыялісты, таму патрэбныя стыпендыі на навуковыя стажыроўкі ды абмен выкладчыцкімі і навуковымі кадрамі. Замежныя даследчыкі павінны мець магчымасць паназіраць за працэсам навучання беларускай мове як замежнай у Беларусі. Кантакт з выкладчыкам носьбітам мовы (*нэйціў-спікер*) неабходны. З другога боку беларускія адмыслоўцы павінны мець досвед у працы за мяжой. Такі абмен спрыяе выпрацоўцы лепшых матэрыялаў, метадаў навучання і г. д. Можа таксама даць магчымасць кансалідацыі навуковага асяроддзя, якое ў розных краінах займаецца беларусістычнай глотадыдактыкай. Гэта магло б паспрыяць стварэнню нейкага будучага форума – больш афіцыйнага таварыства, напр. Міжнароднага камітэта па беларускай мове як замежнай альбо Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў беларускай мовы.

Літаратура

1. Баршчэўская, Н. Сітуацыя беларускай мовы ў Польшчы // Новае слова ў беларусістыцы. Мовазнаўства. Матэрыялы Міжнароднага кангрэса беларусістаў, Мінск 20–21 мая 2010 года, Belarusika = Albaruthenica. 2012. № 32. С. 342 – 353.
2. Баршчэўская, Н. Дасягненні Кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта // Białorutenistyka Białostocka. 2013, № 5. С. 483 – 489.
3. Барысенка В., Праблемы выкладання беларускай мовы як замежнай у вышэйшай школе, Новае слова ў беларусістыцы. Мовазнаўства. Матэрыялы Міжнароднага кангрэса беларусістаў, Мінск 20-21 мая 2010 года, Belarusika = Albaruthenica. 2012. № 32. Мінск 2012. С. 392 – 394.
4. Барысенка В., Кныш Л., Куліковіч У., Літвіноўская А., Рамза Т., Семянькевіч А., Тэст па беларускай мове як замежнай. Пачатковы ўзровень. Агульнае валоданне, Мінск 2014.
5. Беларусазнаўства. Навучальны дапаможнік, пад рэд. П. Брыгадзіна, Мінск 1997.
6. Борисенко О.В., Преподавание белорусского языка как иностранного. История и современность// Мова і культура. (Науковий журнал). – К.: Видавничий Дім Дмітра Бураго, 2011. – Вып. 14. – Т. V(151). С 334 – 337.
7. Важнік С. А., Беларуская мова як замежная: сацыялінгвістычны, лінгваметадычны і ўласна лінгвістычны аспекты, Язык и социум. Материалы VI Международной научной

конференции, 3-4 декабря 2004 г., Минск, редколлегия: Л. Н. Чумак (ответственный редактор) и др., Минск, 2004. С. 19-24.
8. Важнік С.А., Савіцкая І.І., Культура і гісторыя беларусаў: тэксты і заданні. Вучэбны дапаможнік па практыцы беларускага маўлення для замежных студэнтаў, Мінск, 2003.
9. Гаворым па-беларуску. Вучэбны дапаможнік па беларускай мове для замежных навучэнцаў, пад рэдакцыяй Л.І. Сямешкі, Мінск 1999.
10. Ждановіч, В., Слоўнік для дзяцей белуруска-польскі, польска-беларускі = Słownik dla dzieci białorusko-polski, polsko-białoruski, Мінск 2008.
11. Жуковіч, М. В., Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры, Мінск 2015.
12. Кавалевіч, М., Беларускае школьніцтва ў Польшчы і польскае на Берасцейшыне, Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуска-польскае ўзаемадзеянне ў грамадска-палітычнай, культурнай і адукацыйнай сферах» (Брэст, красавік 1993), Беларусіка Albaruthenica 3. Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне, Мінск 1994, с. 309-312.
13. Калета, Р., Цяжкасці польскае мовы: памылкі беларусаў, якія вывучаюць польскую мову // Arche. 2010. № 4. С. 358 – 400.
14. Клышка, А., Гаворым і чытаем па-беларуску. Самавучак беларускай мовы // Маладосць. 1990. № 11. С. 164 – 168.
15. Кривицкий, А.А., Михневич А.Е., Подлужный А.И., Белорусский язык. Для говорящих по-русски, Минск 2008.
16. Малажай, Г., Месца і роля беларуска-польскіх моўных супастаўленняў і перакладу ў падрыхтоўцы настаўніка-філолага, Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуска-польскае ўзаемадзеянне ў грамадска-палітычнай, культурнай і адукацыйнай сферах» (Брэст, красавік 1993), Беларусіка Albaruthenica 3. Нацыянальныя і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне, Мінск 1994, с. 365-370.
17. Павловская, Н.Ю., Борисенко, О.В., Васюченко, П.В., Кныш, Л.С., Семенкевич, О.В., Чеховский, Г.К. Белорусский язык для стран СНГ: учебник, Москва, 2012.
18. Протчанка, В.У., Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове, Мінск, 2001.
19. Рамза, Т.Р., Беларуская мова? З задавальненнем! Для замежных навучэнцаў, Мінск 2010.
20. Рамза Т., Кіёсава С., Усуяма Т., 2016, *Спрабуйма! Азнаямяльна-пачатковы курс беларускай мовы для японцаў. Частка I,* Цукубскі ўніверсітэт.
21. Станкевіч, Л., Каткіч, Ж., Дваццаць сустрэч з Беларуссю. Падручнік па беларускай мове для пачаткоўцаў. Пад аульнай рэдакцыяй А. Золтана. Будапешт 2006.
22. Сысой, Н.М., Прафесійная кампетэнцыя выкладчыка беларускай мовы як замежнай // Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы. 2008. Вып. 7. С. 107 – 110.
23. Хоміч, М.В., Беларускія і польскія прасадычныя адзінкі на занятках беларускай мовы як замежнай: кампаратыўны аспект // Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы. 2010. Вып. 9. Да 80-годдзя з дня нараджэння прафесара Леаніда Іванавіча Бурака. С. 110 – 114.
24. Чахоўская, Т.Л., Метады даследавання ў методыцы выкладання беларускай мовы як замежнай // Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы. 2006. Вып. 5. Да 70-годдзя з дня нараджэння доктара філалагічных навук, прафесара Арнольда Яфімавіча Міхневіча. С. 175 – 180.
25. Чахоўская, Т.Л., Урок па практыцы беларускага маўлення. Структура ўрока // Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы. 2011. Вып. 10. Да 90-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. С. 90 – 97.
26. Чахоўская, Т.Л., Мэты і задачы навучання беларускай мове як замежнай // Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы. 2014. Вып. 13. С. 62 – 71.
27. Чахоўскі, Г.К, Методыка выкладання беларускай мовы іншаземцам як вучэбная, навуковая і практычная дысцыпліна // Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы. 2006.

Вып. 5. Да 70-годдзя з дня нараджэння доктара філалагічных навук, прафесара Арнольда Яфімавіча Міхневіча. С. 180 – 196.
28. Чахоўскі, Г.К., Сістэма сродкаў навучання беларускай мове як замежнай // Працы Кафедры сучаснай беларускай мовы. 2011. Вып. 10. Да 90-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. С. 97–106.
29. Яленскі, М.Г., Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка, Мінск, 2005.
30. Barszczewska, N. Zakres użycia języka białoruskiego na przełomie XX–XXI wieku // Acta Albaruthenica. 2014. № 14. S. 87–98.
31. Goral A., Kulturoznawcze materiały z internetu na lekcjach języka białoruskiego w szkole wyższej, Нацыянальна-культурны кампанент у дыялектнай і літаратурнай мове: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф. (Брэст, 18-19 кастр. 2012 г.) // У-ва адукацыі РБ, БрДУ імя А.С.Пушкіна, рэдкал. М.І. Новік [і інш.], Брэст 2013, с. 48–55.
32. Heyl, S., Weißrussisch. Lehrmaterial zum Kurs Weißrussische Sprache, Berlin 2001.
33. Kaleta, R. Białorusko-polska homonimia międzyjęzykowa, Warszawa 2014.
34. Kaleta, R. Kilka uwag o nauczaniu Polaków języka białoruskiego jako obcego // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Зборнік артыкулаў, Беларусіка=Albaruthenica 36, пад рэдакцыяй І. Э. Багдановіч, Мінск 2015, s. 69–78.
35. Kaleta, R., Polsko-białoruska lapsologia glottodydaktyczna, Warszawa 2015.
36. Kliabanau, D., Крок да кроку знаёмімся з Беларуссю: мова, культура, краязнаўства = Krok po kroku poznajemy Białoruś: język, kultura, krajoznawstwo, Kraków, 2010.
37. Łoginow, J. Język białoruski. Podręcznik dla Polaków zainteresowanych Białorusią i Ukrainą, Kraków 2012.
38. Pashkevich, V., Fundamental Byelorussian, Book 1, Toronto 1974, Book 2, Toronto 1978.
39. Programy nauczania języka polskiego jako obcego. Poziomy A1–C2, pod red. I. Janowskiej, E. Lipińskiej, A. Rabiej, A. Seretny, P. Turka, Kraków 2011.
40. Stankevich, G., Conversational Belarusian for English-speaking students, Prague 2001.